# Электронны сшытак
# па падрыхтоўцы да алімпіяды
# па беларускай літаратуры
# 5 клас
# Частка 2
# Тэма “За смугою стагоддзяў””

Прозвішча________________________________

Імя _______________________________________

**Заўвага.** Дадзены электронны дапаможнік рэкамендуецца выкарыстоўваць толькі ў электронным выглядзе, так як у папяровым варыянце немагчыма выканаць інтэрактыўныя заданні.

2019\2020 навучальны ггод

ДУА “Пагародзенская сярэдняя школа”

# ТЭМА. Вусная народная творчасць

**ЦЫТАТА ДНЯ**



*Беларуская народная творчасць... гэта мора, якое хавае ў сабе незлічоныя скарбы. Толькі трэба ўмець гэтыя скарбы дастаць.*
*Максім Гарэцкі*

# ТЭАРЫТЫЧНЫ БЛОК

1. **Асноўныя тэрміны : фальклор, казка, прымаўка, прыказка, загадка, легенды, паданні, прыкметы і павер'і.Паўтарыць матэрыял можна, азнаёміўшыся з [прэзентацыяй "Вусная народная творчасць"].**
2. **Запоўніце інтэлект-карту звесткамі, якіх у ёй не хапае**



3. **Выканайце інтэрактыўнае [практыкаванне “Народныя казкі і легенды”]**
4. **Праверце сябе , выканаўшы [тэст “Вусная народная творчасць”]**

**Балы за тэст_______________**

**Разам з сябрамі можна адказаць на пытанні вiктарыны “Казка- у жыцці падказка” (каб было цікавей гуляць, трэба скачаць гульню на камп’ютар)**

## Практычны блок

1. **Вызначце і падкрэсліце чацвёртае лішняе ў кожным радзе. Абгрунтуйце свой выбар.**

а) Сцяпан, Піліп, Іван, Андрэйка.

Абгрунтаванне:____________________

б) Зачын, трохразовыя паўторы дзеяння, канцоўка, вобразнае апісанне ўтоенага прадмета.

Абгрунтаванне:___________________________

| | Цытата | Назва твора (калі ёсць) | Жанр |
|---|---|---|---|
| 1 | «..Сядзелі на зялёнай мураве дзяўчаты і хлопцы. Адзін з іх, прыгожы чарнявы юнак, падышоў да пана». | | |
| 2 | «Калі яны пастарэлі, гаспадары павыганялі іх з двароў. Неяк раз уночы сышліся ў лесе гэтыя бяздомныя». | | |
| 3 | Трэба нахіліцца, каб з ручая напіцца. | | |
| 4 | «Стаіўся ён, углядаецца. Аж бачыць — ляціць да яблыні вялікі залаты птах. Падляцеў блізка і | | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | хацеў яблык схапіць, а... злаўчыўся ды цап яго за доўгі хвост!» | | |
| 5 | «Два дні, забіўшыся ў кут, моўчкі трывала, а на трэці, калі зусім прагаладалася, завыла на ўвесь лес». | | |
| 6 | Зімой грэе,вясной тлее,улетку памірае,увосень ажывае. | | |
| 7 | «Залацістыя валасы тугой касою абкручвалі галаву. Голас у яе быў высокі і гучны». | | |
| 8 | Калі год сухі, купляй пчолку, калі мокры-кароўку. | | |
| 9 | «Акрыяла тая, расце як на дражджах» | | |
| 10 | Смачны бабе арэх, ды зубоў бог не даў. | | |
| 11 | «Перапалоханыя да смерці... (а гэта яны жылі ў хаціне) выс каквалі праз вокны і дзверы і беглі куды вочы глядзяць». | | |

3. **Вызначце тэму кожнай групы народных выслоўяў.**

а) Дарагая тая хатка,дзе мяне радзіла матка.
Дзе маці нарадзіла, там і радзіма.
Мілы тоц куток,дзе рэзаны пупок.

Тэма____________

б) Чужына не грэе.
Чужая старана тугою арана., слёзкамі засявана.
Чужына не родная матка: хлеба не дасць.

Тэма________________

в) Хто людзям не верыць,той і сабе веры не дасць.
Хто ў бядзе не быў, той сапраўдных прыяцелей не знае.
Шануй людзей,то і яны табе паспагадаюць.

Тэма_________________

**4. Падбярыце да літаратурнага твора найбольш прыдатныя выслоўі з правага слупка (выдзеліце іх колерам):**

| | |
|---|---|
| Моцна хлопчык занудзіўся<br>Па сям'і,па маме,<br>Як бы свет тут зачыніўся<br>Ў гэтай нудней яме.<br>Усё тут дзіка, нецікава,<br>Бы ў яловым лесе,<br>Кожны вугал неласкава<br>Глянуў на Алеся.<br>Усё не так,як там,дома:<br>Лавы,печ старая,<br>Кожна рэч тут незнаёма<br>І яму чужая…<br>Я.Колас «,Першы заработак» | 1. *Ой,дзеці, дзеці,куды вас падзеці?*<br>*2. Не чапай ліха, няхай сядзіць ціха.*<br>*3. Ад рук адбіўся.*<br>*4. Разумным дзіця не родзіцца.*<br>*5. Людзі навучаць,як жыць на свеце.*<br>*6. Чужая старана—цёмны лес.*<br>*7. У сваім краі,як у раі.*<br>*8. Якое дрэва, такі клін,які бацька,такі сын.*<br>*9. Кожнаму свой куток мілы.* |




**Хвіліна адпачынку. Прапануем заглянуць ў кінаклуб і паглядзець анімацыйны [фільм "Беларускія прымаўкі"]**

**5. Дадзена першая частка прыказак. Падбярыце з прапанаваных правільную другую частку.**

**1) Хто чужога не шкадуе, …**

**2) Кінь перад сабою, …**

**3) У людзей пытай, …**

**4) Як гукнеш, …**

**… так і адзавецца,**
**… ды свой розум май,**
**… знойдзеш за сабою,**
**… той свайго не мае.**

6. . ***Пазнайце, пра якія творы ідзе гаворка.***

**1.** Часта яны пачынаюцца традыцыйнымі рыфмаванымі зачынамі і маюць канцоўку. Сярод іх умоўна вылучаюць тры віды. Узніклі яны ў

глыбокай старажытнасці. Вылучаюцца шырокім выкарыстаннем вымыслу. ………………………………..

2. У гэтых творах распавядаецца пра мінулае і сучаснае: стварэнне сусвету і зямлі, паходжанне людзей, жывёл, птушак, рэчак і азёр, паходжанне імёнаў і прозвішчаў. Пра жыццёвыя з’явы і рэальных герояў звычайна расказвае сведка ці сам удзельнік падзей. Адзнакай гэтых твораў з’яўляецца наяўнасць у іх элементаў фантастыкі: неверагодныя здарэнні, незвычайныя героі, дзівосныя прыгоды……….

3. Гэтыя творы – выдатныя ўзоры вобразных і трапных характарыстык прыродных з’яў, прадметаў і рэчаў. Яны ствараюцца на аснове параўнання, супастаўлення ў нечым падобных з’яў і прадметаў. Па форме некаторыя з іх падобныя да кароценькіх вершыкаў……………..

4. Мудрыя продкі пакінулі нам гэтыя творы ў выглядзе лаканічных, вобразных, сакавітых выслоўяў. Часцей за ўсё яны складаюцца з дзвюх частак – паведамлення і вываду. У іх акрэслены тыя маральныя законы і правілы, якімі чалавеку неабходна кіравацца заўжды: у будні і ў святы, на працы і ў час адпачынку, у гасцях і ва ўласнай хаце. Звычайна яны маюць пераносны сэнс…………………………………

7. **Як правільна перакласці прыказку з рускай на беларускую мову “адзін с сошкой, а семеро с ложкой”?**

а) не перакладаецца;

б) якое карэнне, такое і насенне;

в) сямёра аднаго не чакаюць;

г) адзін горбіцца, а сто корміцца;

д) на языку мядок, а на сэрцы лядок.

8. **Як у народзе кажуць, калі просяць зрабіць паслугу па дабрыні, а не па абавязку? Выберыце правільны варыянт.(выдзеліце колерам)**

А) не ў службу, а ў дружбу. Б) не столькі работы, сколькі клапоты В) не ты першы, не ты апошні Г) ні села, ні пала, захацела баба сала Д) завіхайся, але не спяшайся

9. **Як называюць мурашак у загадцы** *семсот… змуравалі царкву без вуглоў*?

маляроў, мастакоў, муляроў, плотнікаў, будаўнікоў

10. **Дадзена першая частка прыказак:**

1) Кінь перад сабою,…

2) У людзей пытай,…

3) Як гукнеш,…

**Падбярыце з дадзеных правільную другую частку:**

так і адзавецца, знойдзеш за сабою, ды свой розум май

11. **Запішыце тэкст па-беларуску. Звяртайцеся да *слоўніка***

Словари необходимы человеку. Они такие же учителя, как  и книги, театры, журналы…Трудно представить себе человека, который знал бы свой язык в такой мере, что ему вовсе уже не нужна помощь словаря.

Словарь родного языка  – это одна из самых необходимых книг для каждого образованного человека.

…………………………………………………………………………………...

**РЭФЛЕКСІЯ.**

| | |
|---|---|
| **Мне было лягчэй выканаць** | |
| **Узнікла праблема** | |
| **Мне было цікава** | |
| **Цяжка было выканаць** | |